№ 80 Ausgabe B.

ГОМАН

Цана з перасылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—10 м. 80 фэн., на ½ году—5 м. 40 ф., на 3 месяцы—2 м. 70 ф., на 1 мес.—90 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цана абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літарамі — 25 фэніг.; дробныя абвесткі— па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 80 (276). Год III. Вільня, 11 кастрычніка 1918 г. Цана 10 фэн. (5 кап.)

10 кастрычніка.

Заходні тэатр.

На фронце Камбрэ-Сан-Кантэн вораг пад вечар стаяў на ўсход ад лініі Бэртры—Бюсін'і—Боэн. У Шампані французы і амэрыканцы ізноў павялі концэнтрованую атаку між Аргонамі і хрыбтом Орн. Яны адбіты з цяжкімі шкодамі. Вораг удзёрся ў Корнэ, але быў адразу выкінуты. Між Маэр і Маас вораг вёў атакі проціў Сомранс і Комонь. Пасьля майначных баёў мы ўтрымалі абодва месты. На ўсходнім беразе Маас усе атакі ворага адкінуты.

ПАРЫЖ. 8.X. (Гавас). Парлямэнт меў сёньня першае пасяджэньня пасьля мірнага прадлажэньня цэнтральных дзяржаў. З вельмі малымі выняткамі ўсе прамоўцы казалі, што перагаворы датуль немагчымыя, пакуль вораг не дасьць пэўнасьці аб сваей адкрытнасьці і бязумоўна ня згодзіцца на ўсе вымаганьні Вільсона.

Клемансо казаў, што быў на пасяджэньні саюзьнікаў і вынёс адтуль прыемнае ўражаньне.

ЦЮРЫХ. 9.X. На апошнім пасяджэньні нацыянальнага конгрэсу францускіх соцыялістаў Рафэн дю Жан выказаў, што трэба здаволівацца аўтономіяй Эльзас Лётарынгіі, што вызвала заўзяты протэст большасьці. Вуртомніль казаў, што жыхары Эльзас-Лётарынгіі, якія пачуваюць сябе французамі могуць быць пераселянымі ў Францыю. Гэта вызвала буру супярэчак.

БАЗЭЛЬ (Гавас). 9.X. Англіцкі міністар працы Гэндэрсон выказаў, што трэба замацаваць мірныя вымаганьні саюзьнікаў. Пасьля міру трэба будзе прыняць Нямеччыну да саюза народаў, калі яна адкажацца ад мілітарызму і прыме дэмократычныя парадкі.

БЭРЛІН. 10.X. Адказ Вільсона для нямецкага друку ня ёсьць нечаканы. Ня трэба быць оптымістам, але адказ Вільсона можа служыць асновай для замірэньня і пасьля міру.

Гэнерал Людэндорф прыехаў сюды для учасьця ў перагаворах ураду і парлямэнту. Консэрватары вымагаюць адразу склікаць Рэйхстаг для абсуджаньня адказу Вільсона.

Урадовы „N.D.Z." заяўляе, што адказ Нямеччыны Вільсону, які ён сабе будзе, будзе мець на ўвазе толькі інтэрэсы Нямеччыны і яе будучыны.

«Vossische Zeitung» піша, што балей нельга было чакаць.

«Vorwärts» піша, што пэрспэктывы для міру памысьльныя, што сьвет прадстаўляе сабою хворага, да якога заглядае ў вакно сонца.

Вельмі правая «Kreuz-Zeitung» піша: «гэта першы раз, што мірнае прадлажэньне цэнтральных дзяржаў не спаткала зусім поўнай адмовы; але нельга быць вельмі оптымістычным».

Аграрная „Deutsche Tageszeitung" выказывае, што варункі Вільсона для заключэньня замірэньня зусім ня могуць быць прынятымі.

„Lokal-Anzeiger" кажа, што нямецкі народ павінен спакойна чакаць пастановы свайго ўраду, але быць гатовым на ўсё, каб абараніць чэсьць і будучыну Нямеччыны.

Клерыкальная „Germania" кажа, што ўжо паказаўся золак міру, але ад даговоркі мы вельмі далёка. „І цяпер яшчэ адзінай забаспекай Нямеччыны ёсьць яе армія".

БЭРЛІН. 9.X. Прадстаўнік Інфлянскага сэйму падаў рэйхсканцлеру просьбу, каб пакінуць нямецкае войска ў Інфлянтах да міра, у якой між іншым кажыцца: „у спаўненьні дадатковае ўмовы нямецкія войскі, пачынаючы ад 22 верасьня пачалі ачышчаць пагранічны да Дрыйскага павету Лепельскі павет Вітэб. губ. Немцы падтрымовывалі там добры парадак. Пачынаючы з гэтага дня няшчаснае насяленьне гэтага павету выдаецца на міласьць дзікіх бандаў, якія ўрав-жа напльні з усходніх зямель і прылучылі да сябе істнуючыя там падонкі грамадзянства. Вашай Вялікагэрцогскай Высокасьці я перадаю ад імя інфлянскага насяленьня мальбу, каб нямецкі ўрад пакінуў окупацыйнае войска да міру ў паветах Дзьвінскім, Дрыскім, Рэжыцкім, Люцынскім і Астроўскім. Нашая старонка, у разе, калі Нямеччына адмовіцца ад сваей абароны, была б аддадзена на руіну, на зладзействы такія самыя, якія банды бальшэвікоў ужо парабілі ў суседніх ад нас мяйсцох".

ПАРЫЖ (Гавас). 8.X. Ужо па раней устаноўленай умове між саюзьнікамі Байрут назначаецца сталіцай сырыйскага ўзьбярэжжа, што падчыняецца Францыі. Камісар будзе ўпраўляць местам ад імені Францыі.

ШТОКГОЛЬМ (Рэўтэр) 9.X. З Пецярбурга наказываюць, што б. міністар генэрал Трэпов і начальнік паліцыі ў Пецярбурзе разстрэлен.

ВАРШАВА. Міністар-прэзыдэнт Кухаржэвскі адмовіўся ўтварыць новае міністэрства. Ен заявіў аб нехаценьні утварыць наперад міністэрства.

БЭРЛІН (В.Т.Б). 9.X. Першы тыдзень непрыяцельскіх масавых штурмаў у Фляндрыі паказаў пэўную ўдачу нямецкіх лётальных сіл. Пачынаючы з 25 верасьня да 5 кастрычніка нашыя лётальнікі у Фляндрыі зьбілі 96 непрыцельскіх самалётаў і ўтрацілі самі толькі 6.

Вільня, 11 кастрычніка 1918.

Калі расейскі народ ськівуў з сябе надламанае вайной ярмо царскага зьдзеку, яму здавалася, што ён ськінуўшы ярмо з сваіх плеч павінен і можа памагчы іншым народам асвабадзіцца ад усякае крыўды і несправядлівасьці. Усе найлепшыя думкі найсьвятлейшых сыноў расейскага народу, здавалася, знойдуць спаўненьне: зробіцца усё, аб чым думалася; усе лятуценьні стануць жыцьцём; брацтва, роўнасьць і свабода запануюць на сьвеце.

Так здавалася ў першы «мядовы» месяц рэвалюцыі, такі плодны высокімі і добрымі думкамі. Жыцьцё вельмі хутка даволі насьмяялася з гэтых думак, бо расейскі народ ня толькі што ня здольны быў паказаць, як трэба будаваць новае жыцьцё, але, наадварот, паказаў, як ня трэба. Народ яшчэ не дарос да таго, каб утрымацца на гэткай вышыні, яму галава закруцілася і ён зваліўся ў самае балота, патраціўшы і падаптаўшы свае найясьнейшыя і найчысьцейшыя думкі.

Але ня ўсім думкам суджана было змарнавацца і згінуць: другія народы захавалі іх, каб у добрую гадзіну выставіць іх на сьвет Божы.

Аднэй з такіх думак ёсьць права народаў на самаазначэньне. Першая аб ім голасна загаманіла расейская дэмократыя, калі, заразжа пасьля рэволюцыі, паслала адозву да ўсіх ваюючых, што мір павінен быць зроблены „без аннэксый і контрыбуцый на аснове самаазначэньня народаў". Праўда, тая самая дэмократыя ня вельмі была вялікім ахвотнікам усялякіх самаазначэньняў і сама паставіла чорны крыжык на сваіх словах. Самаазначэньне народаў нарабіла шмат гоману і толькі. Хутка аб ім блізка што й забыліся на шырокім сьвеце, найхутчэй там, у каго з гэтага боку было нячыстае сумленьне.

Але думка была справядлівая, і да яе прышлоса вярнуцца. Вось у апошні час чуем, што, напрыклад, Аўстрыя мае перабудавацца на аснове самаазначэньня народаў. І ў другіх дзяржавах пачынаюць гаварыць аб гэтым самым. Бо цяперака пачынаюць усе разумець, што калі ня даць справядлівасьці народам, то ніякага міру на сьвеце і быць ня можа, бо той народ, што скрыўджаны і хоча дабіцца лепшае долі, заўсёды будзе старацца шкодзіць свайму ворагу, будзе з ім дужацца і ніколі не ўспакоіцца. Такі народ будзе бунтавацца і нагаварываць іншыя народы на вайну проціў свайго ворага. А калі другія народы спакойна могуць бачыць несправядлівасьць, то, значыць, яны самыя мала стаяць за справядлівасьць і самыя могуць крыўдзіць і прыціскаць іншы народ. Хто ня ўступаецца за права і справядлівасьць, той сам права не шануе.

Дагэтуль так яно і было. Кожын народ меў свае права і законы і ўжываў іх для сябе. Але паміж народамі ня было ніякае справядлівасьці, ніякага права. На першым мейсцы стаяў кулак. Усе народы «недзяржаўныя», што страцілі сваю незалежнасьць, былі ў палажэньні парабкоў у народаў дзяржаўных, аддаючы ім працу і здольнасьці. Ніхто іх не пытаўся, можа яны хацелі-б аддзяліцца і жыць асобна: не — ім аб гэтым навет думаць нельга было. Успомнім хоць-бы нябошчыцу Расею—сколькі пад ёй народаў пакутавала: некаторыя вельмі багатыя і культурныя, што першым іх жаданьнем было стварыць незалежную дзяржаву і жыць сваім жыцьцём. Але-ж нельга было вырвацца з мядзьведжых лапаў царскае Расеі. А вырваўшыся з адных лап вельмі лёгка папасьціся у другія, бо хоць і ёсьць незалежныя паміж меншымі народамі, але куды больш з іх падбітых, падданых.

За гэтыя народы і іхную зямлю і біліся дагэтуль дужэйшыя народы: ведама, кожны хацеў заграбсьці ў свае лапы як найбольш. Каб ня гэтая ненасычаная прагавітасьць вялікіх народаў (як кажуць, імпэрыялізм), то сьвет ня бачыў бы цяпер таго страшнага відовішча сусьветнай вайны, якое мы маем.

Затапіла вайна морам няшчасьця ўвесь сьвет, так змучыла ўсіх, што цяпер хіба што няма большага жаданьня ў людзей за тое, каб толькі яна скончылася і ніколі больш не ўздымалася.

Вось пачалі гаварыць аб тым, што трэба зрабіць моцны саюз народаў (лігу), каб усе народы спрэчкі паміж сабою адсылалі на паміжнародны суд з выбарных прадстаўнікаў усіх народаў, гавораць, каб па малу разаружыцца і аб тым гаманяць, каб даць волю народам. Кожын народ скажа, чаго ён хоча, якіх парадкаў для сябе ён дабіваецца.

Што павінен адказаць беларус? Чаго трэба для Беларусі?

Беларусь хоча і павінна быць незалежнаю. Яна ўжо колькі раз гэта праз сваіх прадстаўнікаў на ўвесь сьвет абвесьціла. Беларусь паднялася і цяпер ўжо не перастане цьвердзіць усім і ўсюды, што яна жывець, што яна павінна мець правы ня горшыя за другіх, а перш за ўсё, што мае права на свае.

А на што нам Незалежная Беларусь?

Перш-найперш на тое, каб нас не падзерлі на дробныя шматкі нашыя суседзі.

А разьдзяліўшы нас, яны нас адураць; набунтуюць і ўздоймуць адных на другіх — пачнецца разліцьцё крыві паміж роднымі братамі, як гэта ўжо было няраз. Не павінна быць сярод нас «рускіх»

ні «польскіх», бо ўсе мы дзеці аднае бацькаўшчыны, усе мы беларусы!

А калі мы беларусы, то трэба, каб мы і служылі сваей бацькаўшчыне—Беларусі: даволі ўжо намі накідалася рука чужога ўраду па чужой старане, даволі мы навыціраліся чужых куткоў і наабіваліся чужых парогаў — у тым часе, калі чужынцы ад'ядаліся нашым хлебам і нашай працай. Самі ад'ядаліся добра, нам толькі за гэта нічога не давалі. Яны нашым дабром залацілі (і ўсё яшчэ хочаць залаціць) аўтары Масквы і Варшавы.

Але-ж каб нашае дабро йшло толькі на аўтары хоць сабе й не нашыя! Дзе там. Куды больш нашага дабра прагуляна ў сталічных карчмах усяго сьвету. За тое мы, бяз школы, мы без навукі. Яшчэ з нас сьмяюцца, што мы цёмныя, дурныя.

Сьмяюцца, бо-ж мы, запраўды, без'языкія. Без'языкія таму, што мы сваей мовы чураючыся, ніякае ня ведаем і нікому і нічога сказаць ня ўмеем і ня будзем умець, пакуль сьмела па свойму, па беларуску, усюды і з усімі гаварыць не пачнём.

Дык першым дзелам нашым збудаваць Незалежную Беларусь, бо яна нам дасьць сваю мову, свае парадкі, абароніць ад разьдзелу і братняга крыві праліцьця абароніць нашае багацьце ад марнаваньня, бо толькі яна можа нам даць надзею, каб гэты „западны“ край падняўся нараўні з другімі і прылучыўся да саюзу вольных народаў.

Час вельмі важны. Каб гісторыя нас не памінула, хай клічам кожнага беларуса будзе: „Няхай жыве Незалежная Беларусь“.

Падзел Беларусі.

У прошлым нумары была справаздача з паездкі беларускай дэлегацыі ў Кіеў, быў і тэкст пратэсту проціў раздзела Беларусі.

Пратэст гэты датыча конкрэтнага факту—дадатковай умовы паміж Нямеччынай і Расеей аб паўночна-усходняй частцы Беларусі.

Калі-б гэта датычыла толькі гэтых колькі паветаў, то была-бы крыўда, але не такая ўжо вялікая, ад каторай Беларусь магла-бы памерці.

Трэба глянуць на справу глыбей.

Што прадстаўляе цяпер, у гэты мамэнт, Беларуская тэрыторыя?

А вось што: 1) Віленская і Гродненская губэрні далучаны да Літвы; 2) Гомэльшчына да Украіны; 3) Смаленшчына, часьць Вітэбшчыны і часьць Магілёўшчыны астаюцца пад Расеяй; 4) часьць Вітэбшчыны пад Латвіяй; і 5) толькі Меншчына з невялікімі часткамі суседніх губэрняў знаходзіцца ў цэнтры Беларускага жыцьця, пад апекай Беларускіх дзяржаўных устаноў Беларускай Рады і Сэкрэтарыяту.

Такім парадкам Беларусь падзелена на 5 часьцей.

Ня трэба быць палітыкам, каб разумець, што так падзелены край ня можа нормальна разьвівацца.

Ня можа ён жыць ня толькі сваім нацыональным жыцьцём, але і экономічна разьдзел такі—гэта згуба для ўсяго краю, для ўсяго народу.

Есьць ведама, што зьвязь Віленшчыны з Меншчынай, Магілёўшчыны з Вітэбшчынай і Гродзеншчынай, Смаленшчыны з Чарнігаўшчынай і Міншчынай і, агулам кажучы, зьвязь аднэй часткі Беларусі з кожнай другой такая вялікая, што бяз значнае шкоды для кожнай з іх, яны падзелены быць ня могуць.

Кожнаму зразумелы той страх беларусаў перад такім цьвертаваньнем краю

Кожын сусед добра ведае тую шкоду, якую ён робіць беларускаму народу, адрываючы ад яго кусок цела, і толькі свой ўласны эгоізм змушае суседаў нашых карыстаць з нашай палітычнай слабасьці, з нашага малога нацыянальнага самапачуцьця і яны ахвотна ідуць на пажыву.

Усе суседзі, як груганы, зляцеліся і з вялікім апэтытам глядзяць на Беларусь, смакуючы наперад кожын кусочак і узіраюцца толькі часам з зайздрасьцю адзін на другога, каб той не залішне шмат адкусіў.

Мы Беларусы не павінны ціха сядзець і нярыпацца.

Усе способы барацьбы з гэтым гвалтам для нас закрыты і нам астаецца толькі крычаць аб тэй крыўдзе, якую над намі робяць.

Пры такіх умовах і выступіў наш сэкрэтарыят.

А мы усе павінны у гэтым выпадку падтрымапь яго хто чым і як можа.

Ці зробіць пратэст гэты сваю работу ці не — няма ведама, але ідэя захаваньня цэльнасьці у нас узрасьпе яшчэ больш, а суседзі нашы будуць ведаць, што крыўду мы запісалі у сэрцах нашых і што мы сочым за ўсім, што робіцца з намі.

Яны будуць ведаць, што Беларусы гэта ўжо не такая мяртвеччына, як ім здаецца і як яны бы хацелі, а можа навет яны ўспомняць пры гэтым і прыказку: „да пары збан ваду носіць“.

К. Д.

Голас да духавенства.

Вайна, вызваўшы дэмаралізацію народаў, разам з гэтым прынясла жніва для розных цёмных асабістасцей, каторыя прыссаліся піяўкамі да народу і п'юць яго кроў.

Раней бачылі спэкулянтаў „шмуглероў“ на ўсіх патрэбах нашага жыцьця, а цяпер мы спатыкаем новы тып гэтых паноў, але крыху іншага кірунку, — гэта спэкулянтаў на псыхіцы народу, гэта розныя шарлатаны—варажбіты. І да вайны мы іх спатыкалі, бо цемра народу заўсёды бывае добрым полем для працы гэтых паноў. Але раней толькі цёмны народ да іх і ўдаваўся. А цяпер не адзін адвакат або доктар можа пазайздраваць іх кліентэлі, пачынаючы ад пань шуршачых ў едвабах а канчаючы на селяніне ў сермязе — ўсё гэта нясе падатак спэкулянтам на народнай цемры.

А паны варажбіты запіраюць толькі рукі і купляюць сабе прыгожыя мэблі а нават і дамы, і цаб рабыт адных вызывае з'яўленьне ўсё новых і новых шарлатанаў.

Тож у самай Вільні лічба гэтых сыноў цёмры даходзіць да 100.

Але гэтаму час ужо палажыць мяжу, час пачаць змаганьне з спэкулянтамі на цёмры народу, толькі да гэтага трэба, каб узяліся за работу тыя, што маюць павагу і пашану народу—гэта духавенства. Трэба, каб нашае духавенства пакінула весьці патрыотычныя казаньні аб каралёх, што некалісь панавалі ў Польшчы, або аб патрэбах „расейскага“ народу, аб яго палітычнай нядолі, бо гэтым беларускі народ ня цікавіцца і яму гэта не патрэбна. Але ён мае права вымагаць, каб яго з амбоны ўчылі ў яго роднай мове, каб ён мог зразумець, што добрае, што благое, бо толькі тады ён зможа пазбыцца ўсіх забабонаў цемры.

Але, тое духавенства, што запраўду хоча працаваць на Божай ніве павінна ўзяць справу у свае рукі і змагацца з народнай цемрай.

Бо запраўды дзіўна выглядае калі ў селяніна што колечы украдуць, а ён цягнецца ня раз некалькі міль да... варажбіта. Але што гаварыць аб селянах, калі адна пані інтэлігэнтная пры заяве ў паліцыі аб кражы казала, што мае падазрэньне на сваю пакаёўку, бо так казаў.. варажбіт.

Так, духавенства мае прад сабой вялікую работу, але трэба, каб яно, пакінуўшы палітыку, запраўды, захацела ўзяць на сябе ролю той лямпы, што павінна асьвяціць народную цемру.

І. Дзубня.

Большэвіцкія парадкі.

Чалавек, толькі што вярнуўшыся з большэвізыі, разказвае. —

Асабістае бязпечнасьці ніякае няма.

Усё знаходзіцца ва ўласьці „чрэзвычком-ў“—(чрэзвычайных камісараў па барацьбе с контррэволюцыяй, сабоτажам і спэкуляцыяй).

Даволі аднаго падазрэньня, каб чалавека схапілі і бяз усяго расстралялі.

Сярод савецкага ураду вялікае бязладзьдзе: няма дня, каб хто з кам'сараў ня ўцёк, схапіўшы казённыя грошы. Часамі ўдаецца ім перабрацца за граніцу, а часта іх ловяць і растрэліваюць. У большэвіцкіх газэтах поўна абвестак: „Уцёк (ня думайце, што конь або сабака) ...камісар з казённымі грашмі. Усяк, хто яго убачыць павінен злавіць і прывясьці ў найбліжэйшы чрэзвычком“.

Дарагоўля немагчымая: пуд жытняе мукі—300 руб.

Прыкладам кажучы, расходы дружыны з чатырох асоб пры выяздзе з большэвізыі: рамізьнікам за дастаўку на станцыю—270 руб. механошам — перанясьці рэчы з фурманак у вагон 120 руб. касіру, — каб прадаў білет — 80 руб; дохтару за рэцэпт на 100 грам спірту — 100 руб.

Фабрыкі закрываюцца, а тыя, што яшчэ ідуць, ледзь дышуць. Усё руйнуецца і, здаецца, затрымаецца толькі тады, калі ўжо ня будзе чаго руйнаваць і дзяліць. А тым часам большэвікі, відаць, жывуць пераконаньнем і надзеяй што з „буржуя“ можна мець усё. Нічога ня трэба рабіць, толькі дзерці „буржуя“, бо на ім сем скур. А зьдзершы скуры — мяса будзе і г. д. Добрая рэч гэты бедны „буржуй“ і мудры той, хто яго выдумаў!

У Вільні і ваколіцах.

× **Папескі нунцый у Вільні.** На гэтых днях прыеждзжае сюды Папескі Нунцый, кардынал Ратті; ён прабудзе тут колькі дзён.

× **Для эміграптаў.** Нямецкі ўрад даводзіць да ведама, што шмат людзей, запісаўшыхся на выезд у Расею ў апошнюю мінуту адказываюцца ехаць.

Другія, праўда, выеждзжаюць, але хутка вертаюцца назад.

Дзеля гэтага ў бліжэйшы час і нямецкае ўпраўленьне ня будзе больш адпраўляць транспартамі эмігрантаў у Расею. За тое будзе ў хуткім часе атпраўлен транспорт у Украіну. Гэта будзе поўне апош-

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫПЕЎКІ.

Розныя прыпеўкі.

У гародзе рожа,
Й за гарою рожа.
Любі, любі мой міленькі,
Хоць я ня прыгожа.

У гародзе мята,
Й за гарою мята.
Любі, любі, мой міленькі,
Хоць я не багата.

У гародзе тычка
Й за гарою тычка.
Любі, любі, мой міленькі,
Хоць я невялічка.

*

Ой Божа-ж мой, Божа-ж мой—
Які я удаўся!
Жонка санкі прапіла,
Што з печы катаўся.

*

Іграй, іграй, іграчу,
А я табе заплачу,
А я хатку прадам,
Табе грошы аддам.

*

А чыя то чарэшанька, а чыя то вішня,
А чыя то чарнаброва за вароты вышла?
То папова чарэшанька, то папова вішня,
То папова чарнаброва за вароты вышла.

*

Мяне дома ня было, — саломачку церла,
Ня бачыла міленькага, — была я умерла.
Ой умерла я, умерла, — панясьлі хаваці,
Убачыла міленькага — стала аджываці.

*

Сядзіць Сударга на печы, а Праява на палу
А я Сударгу зарэжу, а Праяву закалю.

*

Памер, памер, мой харошы,
Пакінуў мне торбу грошы,
Каб я піла і гуляла
І мілага ўспаміпала!
Як пайду я мукі браці,
Дай вазьму ў дуду іграці,
Сама пайду танцаваці;
То ў прысядкі, то ў далові—
Пашла мука па каморы.

*

Сяку дровы, сяку дровы, — куды трэскі ляцяць,
Аддай мяне, матуленька, куды вочы глядзяць.
Сяку дровы, сяку дровы, — куды коцяцца,
Аддай, аддай матуленька, куды хочацца.

*

Сонеька, каласок,
Закаціся за лясок.
Сонеька нізенька,
Нам да хаткі блізенька.

*

Тыры тыры, хлопцам сыры з малаком,
Табы, табы, дзеўкам жабы з часнаком.
Ішлі хлопцы граніцаю, пілі мёд шкляніцаю,
Ішлі дзеўкі мяжою, пілі смалу дзяжою.

*

Як пайду я па ваду і старога паваду,
У пролубку галавой—пагуляю удавой.

*

А па мору селязенька плывець,
Вышэй берагу галоўку нясець.
Нясець, нясець, ды пакручаваець,
А хто любіць не разлучаваець;
А на моры вада круціцца,
А хто любіць не разлучыцца.

*

Скакалі сарокі з колу на кол,
Кабы нашым хлопцам скульле ў хахол!
На гарэ-горцы рос купарос,
Кабы нашым хлопцам скульле у нос!
На гарэ дуб'е падагрэла,
Кабы нашых хлапцоў пазгалела!

няя мажлівасьць выехаць у Украіну. Хто хоча эміграваць, нехай запісываецца.

× **Ружанец** (пацеры) за мір пачаліся 1-го кастрычніка ў касьцелі сьв. Міхала.

× **„Літоўскі банк“.** Віленскае Т-во ўзаемнага крэдыту пачало 3 кастрычніка сваю працу пад фірмаю: «Літоўскі Банк у Вільні» на сьв. Юрскім прасп. 18.

× **Здача гумы.** Штадтгауптман апавешчае што гаспадары гумовых кол замест колаў могуць даць другую добрую гуму і гэтым аслабаніць сябе ад рэквізыцыі да 1-га красавіка 1919 году. Хто ня дасьць гумы да 20 кастрычніка г. г. у таго будуць рэквізованы колы без аплаты.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошн я дві была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
7 — 8	+ 14,4°	+ 6,2°
8 — 9	+ 14,5°	+ 3,0°
9 — 10	+ 14,9°	+10,8°

З усяго Краю.

МЕНСК. З 1 кастрычніка ў Менску адчынілася каталіцкая духоўная сэмінарыя.

Вялікую падмогу для сэмінарыі дала, як заўсёды, гатовая памагчы каталіцкай і беларускай справе княгіня М. Радзівілова.

У Менскай духоўнай сэмінарыі будзе выкладацца беларуская мова, гісторыя і літэратура. Гэтак выходзіць, што менская дыэцэзія ёсьць першая, ў каторай запраўды парупіліcь аб роднай мове нашага народу.

Рэктарам духоўнай сэмінарыі назначаны кс. доктар Абрантовіч інспэктарам кс. Лісоўскі, магістар тэолёгіі — абодва шчырыя беларусы.

Трэба яшчэ заўважыць, што сувязь ксяндзоў беларусаў лічыць каля 200 членаў.

Рэгістрацыя ваенных шкод.

У самым блізкім часе пачнецца у нашым краі рэгістрацыя шкод, прычыненых вайной. Аб далейшым будзе асобнае апавяшчэньне.

ГРОДНЯ. Ад панядзелку 7 да чэцьвера 10 тутака выдавалі на карткі па 3 руск х фунты солі па цане 20 фэнігоў за фунт.

За вялікую нечыстату у сваім салёне парыкмахер Станіслаў Шока Татарская 3, аштрафованы.

У верасьні Янкель Лупенскі пабіў Анелю Мошчар за тое, што яна выгнала з саду сваіх паноў яго карову. Міравы суд засудзіў Лунеўскага на 300 марак.

ГРОДНЯ На чародные 6 картачак на бульбу, будзе выдана 120 рускіх фунтаў бульбы.

Нейк Суховлянскі засуджаны на 2 месяцы у турму за спробу выдаць яму за награду з конскага лазарэту каня.

ГРОДНЯ. 30 верасьня на адным двару знайдзен фурман з возам нагружаным мукой. Конфіскована 15 мяхоў мукі і 3 мяхі отруб й. Гаспадар, жыд, аддаены пад суд.

БЕЛАСТОК. Прыказам Штатгаўптмана усе крамы павінны зачыняцца а 7 гадз. а аптэкі а 9.

Усе прамысловыя прадпрыемствы, каторыя маюць свае маторы, павінны спыняцця ад 3 гадзіны да 11 ночы.

Гэта мера вызвана вялікай патрэбай цывільнага насяленьня, не маючага другога сьвету, на электрычаства.

БЕЛАСТОК. На Ліповай вуліцы злодзеі укралі з аднае кватэры партфэль з 3000 марак, 500 рускімі рублям, залатым дамскім гадзіннікам з ланцужком.

У начы з 30 верасьня на 1-га кастрычніка на Мало-Сульскай вул цы злодзеі выламалі хлеў і укралі 8 гадоў карову з жоўтымі плямамі і з зламаным рогам.

ДЗЬВІНСК. У быўшым рускім ваенным госпіталі устроены лагер для бежанцоў, вертаючыхся з Расеі.

На берагу пекнага возера Шунія, сярод дужа прыгожага парку устроены цэльны барачны горад у каторым можа змесьціцца каля 3000 людзей.

Бежанцы устраіваюцца у бараках паводлуг св йго соцыяльнага палажэньня.

У вошапр дку могуць адразу пайсьці 500 чэлавек.

Асобны аддзел устроены у лагеры для хворых і эпідэмічных, а так сама радзільны прыют.

Да лагера ідуць дзьве галіны жалезнай дарогі: адна вузка-калейна — нямецкая, другая шырокая — руская.

СЬВІСЛОЧ. На тую старану Прэсбы найдзен труп мужчыны каля 30 годоў з рэзанымі ранамі на тварыі вяроўкай на шыі. Па усім прыметам забойства было зроблено не на тым мейсцы, дзе быў знайдзены труп.

СОПОЦЬКІН. Тут у двох выпадках установлены патайны убой сьвіней. Мяса сконфіскавана. Гаспадароў судзяць.

НОВІСТЫ. У начы на 1-го кастрычніка у Александра Кэфэра укралі 2-летняга рыжага каня.

Вайна ці Мір.

БЭРЛІН. Румынскі міністар-прэзыдэнт Маргіломан суліць цэнтральным дзяржавам нэйтральнасьць і абарону граніц за „некаторыя компэнсацыі“. Відаць гутарка ідзе аб тых стратах, каторыя панесла Румынія па Берасьцейскай умове. Рэч ідзе мусіць аб паўдзёнай Дабруджы, каторую саюзьнікі суляць Боўгарыі.

За гэту цану Румынія гатова стаць у фронт проціў Боўгарыі і Расеі.

РОТТЭРДАМ (В.Т.Б.). 8.Х. Рэйтэр паведамляе што нямецкая мірнае прадлажэньне перададзена ў панядзелак на раніцы Лансінгу.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 8.Х. „Гом лібр“ паведямляе, кліч Клемансо: «Вайна ідзе далей». Газэты выключаюць магчымасьць якога-небудзь упліву соцыялістаў на фронт.

У Парыжы не прыдаюць ніякага значэньня кроку цэнтральных дзяржаў.

ЖЭНЕВА (В.Т.Б.). 7.Х. Нацыянальная Рада францускай соцыялістычнай партыі аднагалосна пастанавіла звярнуцца з маніфэстам да Вільсона, у каторым патрабуе, каб мірнае прадлажэньне цэнтральных дзяржаў не было адкінута бэз перагавораў.

ПАРЫЖ (Гавас). На нацыянальным конгрэсе Кошэн заявіў аб канечнасьці пазнаёмленьня грамадзянскай думкі з жаданьнямі соцыялістаў.

ЛОНДОН (Рэўтэр). Англіцкі друк ясна займае зусім адмоўную пазыцыю. Яны патрабуюць спачатку Бэльгію і Францію, а пасьля перагаворы. Так сама адплаяка Бэльгіі і Францыі за ваенныя расходы. «Iwenіо. telegraf“ піша збыткуючыся: „Мір прадложаны прэзыдэнту Вільсону. Амэрыка не п кажа магкасьці. Да пачатку конфэрэнцый кожын, хто гаворыць ад імені Нямеччыны, павінен даць урачыстую заяву, што праступкі Нямеччыны будуць папраўлены і прызнацца, што гэта былі праступкі. Нямецкі народ павінен быць прымушаны доўгі час плаціць на адбудаваньне Францыі і Бэльгіі“. „Daily kronike“ жадае апрыч таго зьедынаньня «ус х польскіх нацый» «Daily telehraf» заяўляе: «праграма большасьці рэйхстагу ёсьць вял к м прыбліжэньнем да пунтку гледжаньня саюзьнікаў. У пытаньнях аб Бэльгіі, Балтыцкіх правінцый і мірных умоў у Брэсьце і Букарэсьце».

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). 8.Х. Статс сэкрэтар Лансінг паслаў швайцарскаму паслу ноту, у якой між іншым кажа: «Я пацьвярджаю дастачу нямецкага прадлажэньня аб зам рэньні і міры. Перш чым прэзыдэнт Вільсон можа даць адказ, трэба ясна паставіць, ці згаджаецца нямецкі ўрад на варункі, што выставіў амэрыканскі прэзыдэнт 8 студня і пасля. Паміж намі і Нямеччынай могуць вясьціся перагаворы не аб самых пунктах, але аб выпаўненьні іх. Што датычыць замірэньня, то прэзыдэнт Вільсон мог-бы прадлажыць прыняцьце яго сваім саюзьнікам толькі пасьля забавязаньня цэнтральных дзяржаў усюды вывясьці свае войска з занятых зямель».

ЛОНДОН «Mencester Gardian» выказуе, што зам рэньне з немцамі магчыма, толькі пасьля адходу іх да сваіх граніц і прызнаньня такім парадкам сваей няўдачы. «Dejli News» выказуе, што мова прынца Макса Бадэнскага ясная. Мілітарызм і навука аб сіле адкідаюцца і такім спосабам мэта саюзьнікаў дасягнута.

Чэрчыль выказаў, што справядлівыя дамаганьні саюзьнікаў яшчэ ня зусім прызнаюцца цэнтральнымі дзяржавамі, дзеля гэтага ён яшчэ ня верыць у хуткі мір.

Спаўняльны камітэт саюзу англіцкіх работнікаў прыняў рэзалюцыю, у каторай кажа аб злоснай майначнасьці нямецкага мірнага прадлажэньня. Вясьці перагаворы аб міры можна вясьці толькі пры тых варунках як я наложаны на Баўгарыю.

ПАРЫЖ Францускі друк выказуе, што ліквідацыя эльзас-лётарынскага пытаньня паводлуг думкі Нямеччыны немагчыма.

Урадовыя колы заяўляюць, што увесь моральны адказ на шкоды у паўночнай Францыі падае на Нямеччыну. Аб адплаце гэтых шкод Макс Бадэнскі нічога не сказаў.

Францускі урадовы друк выказуе, што вайна павінна цягнуцца да аканчальнай і поўнай перамогі.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). 8.Х. Урадова адказуецца, што аўстрыяцкае мірнае прадлажэньне цяпер ня будзе дадзена.

СКАРУПЫ. Злодзеі улямаліся у вялікі куратнік і зарэзалі на мейсцы многа птушак.

СУВАЛКІ. Прыказам ўласьці насяленьне павінна даваць ураду па 0,3 кілограма ад кожнай авечкі па цане 5 марак за кіло.

ЦЭХАЛЬНЫ. (Скантвільскага пав) Колькі разбойнікаў напалі на селяніна Веперцінскага, яго пабілі, а сына застрэлілі. Яны аграбілі кватэру так, што назаўтра ня было у што апрануць труп забітага. Следства паказало, што да разбой-

---

На гарэ дуб'е прыжывала,
Кабы нашых дзевак прыбывала!

*

Чырвоная рожа, жоўты цьвет!
Не палюбяць мальцы, пайду ў сьвет:
Не з ахвотай — з няволі;
Не цалуюць хлопцы даволі!..

*

А за горадам за гароджаным,
А там цьвяточкі пасаджаны:
Адзін цьвяток — мята багата,
Другі цьвяток — рожа прыгожа,
Трэцьці цьвяток — рута крута,
Чацьвёрты цьвяток — крапіва ляніва.
А хто багаты — пільнуй мяты,
А хто прыгожы — пільнуй рожы,
А хто круты — пільнуй руты,
А хто лянівы — пільнуй крапівы,
А хто ціляпень—пільнуй канапель!

*

Жана мужа паважала,
К папараці прывязала,
Жана мужа ды пацешыла,
Павела ў сад ды павесіла:
«Вісі, мужу, навісіся,
І яблычкаў наясіся,
І вішанькаў пакушаеш
І зязюлек паслухаеш!»
— Жана мая міленькая,
Пусьці мяне жывенькага,
Куплю табе сукеначку
Прыбяру, як паненачку!

*

Дождж у полі курыць, курыць,
А дзед бабу журыць, журыць:
«Ідзі, баба дамоў, дамоў,
А напячы бліноў, бліноў!»
Бабе таго ня хочацца,
Каля печы варочацца,
У тоненькай сарочацццы,
А ў беленькай намётацццы:

*

Біла мяне маці таўкачом:
«Не гуляй, дачка, з панічом!»
А я матцы наругацца,
Штоб з панічом нагуляцца!
Біла мяне маці міскаю:
«Ні гуляй, дачка, із Мішкаю!»
А я матцы наругацца,
Штоб с Мішкаю нагуляцца!
Біла мяне маці паленам:
«Не гуляй дачка з Параменам!»
А я матцы наругацца,
Штоб з Параменам нагуляцца!

*

Плыў чаўнок па рэчцы
Да плакаў цзяцюк па дзеўцы:
«Дзе-ж мне, маладому, дзецца?
Саўю вяроўку з крапівы,
Да павешуся ў бацьвіньні!»
Пайшла маці бацьвіньне ламаці,
«Ня вісі, сынку, ня вісі, –
Да ідзі бацьвіньне паднясі,
Дзеваччына коніка папасі,
За яе вадзіцу паднясі!»

*

На гары сьвятлела,
Казлова барада гарэла.
«Ідзеце, хлопчыкі, гасеце,
Рэшатам ваду нясеце!»
Як у рэшаце вада ёсьць,
Так у хлопчыкаў праўда ёсьць!
На гарэ сьвятлела і г. д.
«Ідзеце дзевачкі, гасеце,
Кубачкам ваду насеце».
Як у кубачку вада ёсьць,
Так у дзевачкі праўда ёсьць.

*

Ляцеў бабёр цераз двор,
На ём сукенак дзевяць пар,
На ём шапачка баброва,—
Загарэлася дуброва.
«Ідзеце, хлопчыкі, гасеце,
Рэшатам ваду насеце!»
Як у рэшаце вада ёсьць,
Так у хлопчыкаў праўда ёсьць!
Ляцеў бабёр і г. д
«Ідзеце, дзевачкі гасеце,
Кубачком ваду насеце!»
Як у кубачку вада ёсьць,
Так у дзевачак праўда ёсьць!

*

Яловае карыта поўна вадой наліта.
Дзевачкі ножкі памылі,
А хлопчыкі ваду выпілі!
Дубовае карыта поўна вадой наліта.
Пшчолкі ножкі памылі,
А дзевачкі ваду выпілі!

нікоў належылі і два хлапцы, каторыя нядаўна уцяклі ад сваіх бацькоў.

ВІЛЯМПОЛЬ. (пад Коўнай). 4-га кастрычніка а 12 гадз. у ночы невядомык людзі замкнулі ключом Юліяна Тараэсвіча у яго ўласнай кватэры, уламаліся у сьвінарнік, зарэзалі сьвіню і уцяклі з мясам.

НІЖНІЕ ШАНЦЫ. (пад Коўнай) Браты Пятроўскія абакралі гаспадыню чайнай „Гэльль“ і уцяклі з адзежай з яе кватэры. Паліція пачала трасьці кватэру бр. Пятроўскіх і знайшла украдзеныя рэчы.

АРМЯНЫ. (Маляцкага пав.) Перад акружным Віленскім судам стаялі земляроб Я. Кіркіс і яго жонка Алена пад абвінавачэньнем забойства сваей ўласнай сястры і швагеркі. Колькі дзён перад Тройцай забітая Тафіля Кіркіс, жыўшая каля 4-х гадоў са сваім братам, шчэзла з хаты. Колькі тыднёў пазней, знайшлі яе труп на 2 кілёмэтры адгэтуль са знакамі ад сякеры і прызнакамі удушэньня.

Муж і жонка Кіркісы заўсёды падтрымліваўшыя дужа дрэнныя зносіны з забітай, падпалі пад падазрэньне. Перад судом Язэпу Кіркісу удалося даказаць, што ён быў у часе забойства упрочках і яго прышлося апраўдаць.

Алена Кіркіс прызналася, што дала сякеру камусьці другому, каб забіць швагерку. Яе засудзілі за супольнасьць у забойстве на 12 гадоў катаргі.

З Фінляндыі.

ШТОКГОЛЬМ. 7.Х. Офіцыёз „Hufwud Dagblatt“ піша: „пры якім хочучы канцы вайны Нямеччына астанецца ў будучыне самай сільнай дзяржавай у Бальтыцкім моры. Дэмократызацiя нямецкага ўраду саўсім не зьмяняе блізкіх зносін паміж Фінляндыяй і Нямеччынай. Нямеччына заінтэрэсавана ў эканамічнай незалежнасьці сільнай Фінляндыі і Фінляндыя лічыць на падтрыманьне Нямеччыны проціў непрадвідзенай расейскай палітыкі.

Украіна.

КІЕУ. 6.Х. Учора было ўрачыстае адкрыцьце першага Украінскага ўнівэрсытэту.

З Польшчы.

ВАРШАВА (В.Т.Б.). 7.Х. Нямецкі канцлер паслаў князю Радзівіллу тэлеграмму, ў каторай паміж іншым гавора: «Я маю цьвёрдую пастанову рэгуляваць адносіны паміж Нямеччынай і Польшчай у духу ўзаемных інтэрэсаў і як мага хутчэй звольніць ад рэшты акупацыі».

БЭРЛІН. Урадовы «Nordd Deutsche Allgemeine Zeitung» паведамляе, што думка, быццам канцлер у сваей тэлеграме да князя Радзівілла абяцаў адразу зняць окупацыю ў Польшчы, абмылковая. Ен толькі абяцае зьмягчыць некаторыя непрыемныя скуткі окупацыі.

ВАРШАВА. 7.Х. (В.Т.Б). Проклямацыя польскай Рэгенцыйнай Рады прызывае польскі народ да стварэньня адынай, непадзельнай Польшчы з усіх польскіх зямель з выхадам да мора. Трэба дамагацца палітычнай, экономічнай і тэрыторыяльнай недакраннасьці, забяспечанай міжнароднымі ўмовамі. Для асягненьня гэтай цэлі Рэгенцыйная Рада прадлагае распусьціць Дзяржаўную Раду, стварыць урад з прадстаўнікаў усіх слаёў і ўсіх партый народу, выдаць выбарны статут на шырокай дэмократычнай падставе, склікаць адразу сэйм і перадаць яму далейшую організацыю дзяржаўнае ўлады.

ВАРШАВА. На Хлоднай вул. забіты чыноўнік Тэодор Цыхлінскі. Начальнік паліцыі назначыў 20 000 мар. за затрыманьне забойцы.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Міністрам імперскага флота назначаны віцэадмірал фон Манн. Міністр еміных спраў падаў у адстаўку.

Міністар унутраных спраў аддаў прыказ каб вядомая мова прынца Макса Бадэнскага была вывешана ў ваўсіх валасьцёх і парахвіях.

БЭРЛІН. 9.Х. (В.Т.Б.). Ваенны міністар, генэрал фон Штэйн, падаў ў адстаўку. На яго мейсца міністрам назначаны генэрал Шэйх. Начальнік патайнага імпэратарскага габінэту выйшаў у адстаўку. Намесьнік Эльзас-Лётарынгіі фон Дальвіц паехаў у Бэрлін. Дзеля таго, што ён праціўнік аўтономіі Эльзаса, то, відаць, ён выйдзе ў адстаўку.

БЭРЛІН. «Germania» паведамляе, што статс-сэкрэтаром унутраных спраў будзе дэпутат Трымборн.

СОФІЯ. 5.Х. (В.Т.Б.). Офіціоз «Пропорэц» даносіць аб абавязку Баўгарыі ачысьціць усе землі Грэцыі і Сэрбіі, занятыя Баўгарамі ў часе вайны.

Баўгарыя абяцае, што ўсё нямецкае і аўстрыяцкае войска ачысьціць Баўгарыю ў 4 тыдні.

КОБУРГ. 7.Х Сюды прыехаў Фэрдынанд Кобургскі, бышы Баўгарскі кароль, са сваім сынам і дружынай дзеля пастаяннага жыцьця.

БЭРЛІН. 9.Х. Усяго налічаецца да 8 кастрычніка 17 здарэньняў азыяцкае халеры, з іх 13 сьмяротных.

Тэлеграмы.

Нямецкія апавяшчэньні.

8.Х. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: На поўнач ад Скарб англійцы пасьля заўзятага агня атакавалі абапал Ші.

У Нэвэрэй яны ўварваліся. У іншых мейсцох яны адкінуты.

Фронт генэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: На поўнач ад Санкантэн англійцы і французы прадаўжалі свае сільныя штурмы. На поўнач ад Монброгэн адбіты 5 разоў атакі ворага. Далей на поўдзень варожы штурм зламаўся пад нашым агнём. Пры Секгаар пасьля ўпорнага бою мы абаранілі свае пазыцыі.

На вышыне Тілюа атакай і контратакай мы адкінулі варожы штурм.

Фронт нямецкага Насьледніка: Стычкі між Айет і Энь. Між Базанкур і Сэль вораг атакаваў вялікімі сіламі, але быў адбіты. Мы ўзялі штурмам Сэнтэц'ен, але контратакай былі выкінуты. Абапал Энь адбіты заўзятыя атакі ворага.

Фронт ф. Гальвіца: Пасьля самага сільнага агня амэрыканцы прадаўжалі штурм абапал Эр. На заходнім берагу Эр, штурмы зламаліся на поўдзень ад Шатэль. З вышыне на поўнач ад Шатэль, каторую ўзяў вораг, мы яго выкінулі контратакай. На ўсход ад Эр варожыя Штурмы зламаліся ўжо пад нашым гарматнім агнём. Пад вечар вораг пачаў узноў свае штурмы абапал дарогі і Шампані на Романь. Пасьля ўпорнага бою мы яго адкінулі.

9 Х. Заходні тэатр.

Між Камбрэ і Сан-Кантэн бітва пачалася ізноў. З вялікімі артылерыйскімі масамі у таварыстве броняых аўтомобіляў і надпавераных эскадр англійцы, французы і амэрыканцы атакавалі між Камбрэ і Сан-Кантэн. На паўночнай часьці фронту штурмы ворага зламаліся пасьля заўзятае бітвы на заход ад дарогі з Камбрэ на Бойен. Вячорныя штурмы ворага тутака таксама адкінуты. Абапал рымскай дарогі, што вядзець у Лё-Като, ворагу ўдаўся глыбокі ўлом у нашыя лініі. Мы затрымалі ворага на лініі Вальенкур—Эльенкур. На поўдзень вораг здужаў толькі крыху прасунуцца наперад. Нашыя войскі на поўдзень ад Монбрэгэн адкінулі ўсе штурмы ворага на сваей пярэдняй лініі. Але з прычыны ўлому ворага на вышэй успомненым мейсцы і гэтае скрыло павінна было адыйсьці назад на заходні бераг ад Фрэгуалё Гран. У Шампані французы пачалі з вялікаю сілаю атакі паміж Сьвіпп і Энь. Толькі з абодвых бакоў Сант Эт'ен вораг уварваўся ў нашыя лініі, але пасьля абеда мы контратакамі выкінулі яго. На рэшце фронту штурмы ворага зусім зламаліся. Вельмі сільныя штурмы амэрыканцаў на ўсходняй часьці Аргонскага лесу і ў даліне Эр адкінуты. На ўсходнім беразе Маас вораг атакаваў паміж Брабан і Оро. Ен уварваўся ў лес Консанвуа, дзе яго затрымалі. На рэшці фрынту яго адкінулі.

Каля вайны.

ВЕНА. 8.Х. **Урадова.** Балканскі фронт. Наша войска ў пастаянных стычках адыйшло назад на прыгатаваныя мейсцы, без уселякай перашкоды ворага.

БЭРЛІН. Аб ваенным палажэньні на Балканах паведамляецца, што нямецкія войскі сьцягіваюцца на поўдзень Ніша а таксама на ўсходнім беразе Марыцы.

БЭРЛІН (В.Т.В.). 7.Х. Нямецкія і аўстрыяцкія лодкі затапілі ізноў 30.000 тонн.

Адна нямецкая падводная лодка уварвалася ў прыстань Карла Форта (Сардынія) і ўзарвала тарпэдай стаяўшы там параход на 6.000 тонн.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.